***Наталля Ляховіч***

# ГЕНДЭРНЫЯ АДНОСІНЫ У МАСЛЕНІЧНЫХ ГУЛЬНЯХ

Сучасная гуманітарная навука, шмат у чым з падачы англамоўных культурных антраполагаў, адрознівае паняцці полу (sex) і гендэру (gender). Першае з іх выкарыстоўваецца для абазначэння анатама-фізіялагічных асаблівасцей людзей, на аснове якіх чалавечыя істоты вызначаюцца як мужчыны або жанчыны. У традыцыйным грамадстве пол чалавека (вызначэнне вышэй узгаданых біялагічных асаблівасцей) лічыўся падмуркам і першапрычынай псіхалагічных і сацыяльных адрозненняў паміж жанчынамі і мужчынамі. Антраполагі, этнографы і гісторыкі даўно выявілі адноснасць уяўленняў аб «тыпова мужчынскім» ці «тыпова жаночым»: тое, што ў адным грамадстве лічыцца мужчынскім заняткам (паводзінамі, рысай характару), у іншым можа вызначацца як жаночае.

Сёння відавочна, што такія тыповыя адрозненні палоў, як, напрыклад, высокі рост, вялікая вага, большая (у параўнанні з жаночай) мускульная маса і фізічная сіла мужчын вельмі няшчыльны і значна менш звязаны з полам, чым было прынята думаць. Існуючая ў свеце разнастайнасць сацыяльных характарыстык жанчын і мужчын і прынцыповая другаснасць біялагічных характарыстык людзей дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што біялагічны пол не можа быць тлумачэннем адрозненняў іх сацыяльных роляў, якія існуюць у розных грамадствах і абумоўлены хутчэй культурай, чым біялогіяй.

Гендэр разглядаецца грамадствам як сацыяльная мадэль жанчыны і мужчыны (асноўных чальцоў грамадства, якія яго самааднаўляюць праз нараджэнне дзяцей), што вызначае іх становішча і ролю ў сям'і, палітычнай структуры, эканоміцы, культуры і адукацыі, і інш. Гендэрныя сістэмы адрозніваюцца ў розных грамадствах, аднак у сучасных еўрапейскіх краінах гэтыя сістэмы асіметрычныя такім чынам, што мужчыны і ўсё «мужчынскае/маскуліннае» (рысы характару, мадэлі паводзінаў, прафесіі і іншае) лічацца першаснымі, значнымі і дамінуючымі, а жанчыны і ўсё «жаночае/фемініннае» вызначаецца як другаснае, нязначнае з сацыяльнага пункту гледжання і падпарадкаванае [1, с. 245]. Часам параўнанні з традыцыйнымі гендэрнымі сістэмамі сведчаць, што сучасныя гендэрныя сістэмы значна менш этнаэкалагічныя, чым традыцыйныя.

Аналітыкі мастацтва адзначаюць, што «побыт славянскіх этнасаў з першых этапаў іхі снавання адрозніваўся своеасаблівасцю… з паганскіх часоў. Менавіта адтуль прыйшло глабальнае паняцце ігрышча» [2, с. 64]. Як сведчаць даведачныя крыніцы, ігрышча, гульня – «від непрадуктыўнай дзейнасці, звязаны з дзеяннямі, абмежаванымі правіламі, якія накіраваныя на стварэнне, развіццё і падтрымку працэсу ў вызначаных межах», а іх задача — «забяспечыць удзельнікам шэраг перажыванняў і эмоцыяў, даць ім набыць новы досвед праз непасрэдны практычны ўдзел. У жывёла ў імкненне гуляць назіраецца ў ювэнільным (калі істота яшчэ маладая – расце і фізічна развіваецца) перыядзе і знікае з часам сталення. Чалавек у гэтым адрозніваецца ад жывёлы ў тым, што захоўвае гульнявыя паводзіны на доўга пасля заканчэння ювэнільнага этапу развіцця» [3].

Традыцыйныя гульні і ігрышчы шчыльна звязаны з абрадамі – сукупнасцю традыцыйных умоўных дзеянняў, што сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабой, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца. Абрады – састаўная частка традыцыйна-побытавай культуры народа, якая фарміравалася здаўна і накіравана на этнаэкалогію этнічнай супольнасці.

Вялікую ролю ў этнаэкалогіі звычайна адыгрываюць адносіны паміж двума паловаміэтнасу – мужчынскай і жаночай, іншымі словамі – гендэрныя адносіны [4, с. 128]. З дапамогай выпрацоўкі гендэрных роляў, накіраваных на самааднаўленне традыцыйных супольнасцяў, этнас рэгулюе сваю колькасць, забяспечвае сваё фізічнае захаванне.

Калі ў сінкрэтычнай абрадавай дзеі спалучаецца гульня, гендэрныя адносіны, магічна-абрадавы кантэкст – мы маем справу з помнікам культуры, які неабходна ахоўваць і для захавання этнічных стэрэатыпаў паводзін, і для фарміравання традыцый самааднаўлення этнасу. Масленічныя гульні - прыклад спалучэння гульні, гендэрнай тэматыкі (матываў шлюбавання і радзін) і каляндарна-абрадавай дзеі (Масленіцай, яе звычаямі). Яны цікавыя і фалькларыстам, і культуролагам, і мастацтвазнаўцам, і сацыяльным педагогам.

Абраднасць Масленіцы, які абраднасць амаль усіх астатніх беларускіх свят, падзяляецца па гендэрнаму прынцыпу. За кожную частку свята мужчыны і жанчыны нясуць сваю адказнасць. Жанчыны адказвалі за магічную і рытуальную частку правядзення свята. Мужчыны былі ў адказе за падрыхтоўку забаўляльнай часткі, залівалі горкі, ладзілі арэлі, рыхтавалі коней. Таксама хлопцам адводзілася другасная роля ва ўдзеле ў гульнявых абрадах.

У першы дзень Масленіцы ўсе пачыналі са сваіх спраў, хлопцы рабілі са снегу вялікія горкі і коўзалкі, жанчыны пачыналі выпякацьбліны, адзін з галоўных пачастункаў Масленіцы. «Першы блін жанчына заўсёды адносіла ў чырвоны кут для ўшанавання продкаў» [5]. Вечарам, пасля абыхода вёскі, жанчыны праводзілі абрадава-забаўляльную дзею «ўшанавання маладухі».Усе жанчыны і дзяўчаты збіраліся ва ўмоўным месцы і ішлі да дзяўчыны, якая вышла замуж у апошні месяц мясаеда, спачатку маладой спявалі ўслаўляльныя спевы, каб у маладой нарадзіліся і хлопчык, і дзяўчынка, і каб ў сям'і ўсё было добра. За гэтыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУКИ

ўслаўляльныя спевы гаспадар павінен быў аддзякаваць блінамі, сырам, маслам, потым маладую саджалі ў сані і са спевамі везлі па вёсцы.

Важнай масленічнай гульнявой падзеяй была гульня «калодка». Ў ёй бралі ўдзел і дзяўчаты і хлопцы, сэнс гэтай гульні выявіць і «пакараць» тых хлапцоў і дзяўчат, якія за мінулы год не знайшлі сабе нявест, або адмовілі сватам. У кучу збіраліся замужнія альбо ўжо заляцаныя дзяўчаты і хадзілі па вёсцы з калодкай ці лапцям, і як толькі яны каго-небудзь злавілі, то з пытаннем: «Чаго той хлопяц альбо дзяўчына не ажаніліся?» – вешалі на шыю калодку і пагражалі, «калі не адкупіцца і не паабяцае, што знойдзе сабе дзяўчыну альбо хлопца, то ўвесь год будзе хадзіць з гэтай калодкай». Таксама на Масленіцу ладзілі шмат гульняў і скокаў, якія ўсяляк спрыялі заснаванню парачак, а ў далейшам і сям'і, такімі гульнямі зяўляліся: Юрачка, Чачотка, Цяцерка, Явар, Падушачка, Жаніцьба Цярэшкі і іншыя гульні, якія маглі ладзіцца не толькі на масленіцу, але і ў астатнія дні. Гэтыя гульні дазвалялі хлопцам і дзяўчатам як мага лепей пазнаць адзін аднаго і злучыцца пад час гульні ў пары, а калі нешта не падабалась, то было магчыма адразу знайсці сабе другую пару. Усе гэтыя гульні праходзілі па вечарах у каго-небудзь ў хаце і абавязкова пад назіраннем старэйшых, каб гульня не перайшла рамак дазволенага.

Катанне на конях і на ледзяных горках таксама мела не толькі забаўляльны характар, але і рытуальны сэнс. Лічылася: чым далей заедзеш на коні ў поле, тым даўжэй будзе лён; а хлопцы каталіся на лядзяшках, прычым, лічылася: хто даўжэй праедзе, той даўжэй пражыве.

Аднак гендэрныя даследаванні, і ў прыватнасці даследаванні амерыканскай вучонай Караль Гіліган паказалі, што спосаб жаночага сама- ўспрымання істотна адрозніваецца ад мужчынскага. У той час як мужчыны ўспрымаюць сябе як адасобленыя аўтаномныя істоты, жанчыны схільныя да ўспрымання сябе як узаемазвязаных істот. Асабліва ярка гэта выяўляецца ў адрозненнях пры прыняцці жанчынамі і мужчынамі маральных рашэнняў. Па-першае, жанчыны больш праяўляюць маральнае стаўленне да іншых, у той час як мужчыны падкрэсліваюць фармальныя, абстрактныя правы, тыповая жанчына здольная засяродзіцца на сваіх правах, калі гэта дапамагае ёй ўмацаваць няўстойлівыя, але вельмі значныя чалавечыя сувязі. Па-другое, прымаючы маральныя рашэнні, жанчыны дэманструюць пункт гледжання, якая прадугледжвае наступствы для ўсіх, хто звязаны з гэтымі дзеяннямі. Мужчыны ў асноўным дэманструюць пункт гледжання, паводле якога прынцыпы павінны выконвацца, нават калі гэта прычыняе боль. Па-трэцяе, жанчыны больш схільныя даравацць крыўды, у той час як мужчыны не мяняюць сваё стаўленне, паколькі гэта супярэчыць справядлівасці.
І, нарэшце, жанчыны, як правіла, трактуюць свой выбар у кантэксце ўзаемасувязі ў навакольнымі, а мужчыны абстрагіруют яго ад абставін. Думаю, што вышэй згаданыя фактары з'яўляюцца доказам таго, што патрыярхат зусім не з'яўляецца лепшай схемай пабудовы грамадскіх адносін. Такім чынам, страціць або набудзе наша грамадства, калі жанчына будзе больш задзейнічана ў грамадскім і палітычным жыцці дзяржавы?

Сення ў беларускім грамадстве адбываюцца працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі, якія садзейнічаюць стварэнню роўных магчымасцяў для рэалізацыі асобы незалежна ад сацыяльнага паходжання, становішча, нацыянальнасці, узросту і полу. Сапраўдная гуманізацыя прадугледжвае і пераадоленне стэрэатыпаў, стагоддзямі пануючых над жанчынамі і ўсталяванне гендэрнай роўнасці ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларусы : у 9. т. Т. 9 : Антрапалогія / Л.І. Цягака. – Мінск : Беларуская навука, 2006. – 575 с.
2. Салеев, В. Актерское мастерство: типология восточнославянских традиций / В. Салеев // Беларускае акцёрскае мастацтва : Шлях і станаўлення і развіцця ў кантэксце еўрапейскіх сцэнічных культур : матэр. міжнар. навук.-творчай канф. (Віцебск, 20-21 лістапада 1996 г.). – Мінск : Права і эканоміка, 1997. – С. 62 – 69.
3. Гендэрные стереотипы [Электронный ресурс]. – Рэжым доступа : www.femina.com.ua/a/252.shtm. – Дата доступа : 03.04.2012.
4. Агульная энцыклапедыя / рэд. калегія : І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 435 с.
5. Беларусы : у 9. т. Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко і інш. – Мінск : Белар. навука, 2002. – 605 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ